ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
20 04 2017 г.

А НА РАБОЦЕ — ДЗІЦЯЧЫ САДОК...

Фота Надзеі БУЖАН.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Пасля чатырох гадоў навучання занялася пошукам месца для размеркавання, — успамінае Яўгенія. — Прыйшла ў аддзел адукацыі, а там прапанавалі работу ў садку. Я спачатку спужалася: як гэта, працаваць з зусім маленькімі дзеткамі? Цяпер магу з упэўненасцю сказаць, што гэта асаблівая праца. Тут і час занятку зусім невялікі, і падыход да дашкольнікаў патрэбны адмысловы. Я, безумоўна, чытала тэарэтычныя дапаможнікі, шукала інфармацыю, але найбольш сваімі практычнымі парадамі мне дапамагла Ала Канстанцінаўна Марусіч, якая працуе тут даўно. Што датычыцца аднагрупнікаў, то яны ў асноўным размеркаваліся настаўнікамі ў школы ці трэнерамі ў спартыўныя вучылішчы.

«Калі параўноўваць са школьнікамі, то працаваць прасцей: у маленькіх дзяцей аўтарытэт дарослага бясспрэчны».

Працоўны дзень кіраўніка фізвыхавання пачынаецца рана — ужо ў 7.30 трэба праводзіць зарадку ў шасці замацаваных за ёй групах. Пасля пачынаюцца заняткі: спачатку ў малодшых дзяцей, потым у старэйшых. Яны прыкметна адрозніваюцца ад заняткаў у школе. Па-першае, усё робіцца пад музыку, якую спецыяльна падбіраюць выхавацелі. Па-другое, сур'ёзную нагрузку маленькім дзецям даваць нельга — усё грунтуецца на падтрыманні фізічнай формы. Акрамя гэтага, вялікі акцэнт робіцца на гульні. Пасля абеду пачынаюцца гурткі: рытмапластыка, элементы сучаснага танцу. У канцы дня — «папяровая праца», якой, па прызнанні Яўгеніі, нямала: план-канспекты на кожны занятак, планаванне актыўнага адпачынку, дадатковых зарадак... Гэта, па словах маладога спецыяліста, найменш прыемны аспект работы. Дарэчы, часам даводзіцца асвойваць і тое, чаму не вучылі ў ВНУ, напрыклад, акцёрскую справу. На кожным ранішніку выхавацелі атрымліваюць свае ролі, вучаць тэкст. Так, на Новы год Яўгенія была Снягурачкай.

— У кожнай групе больш за дваццаць дзяцей, і трэба ўсіх па імёнах ведаць, — смяецца Яўгенія. — Калі параўноўваць са школьнікамі (а я падчас вучобы практыкавалася ў старэйшых класах), то працаваць прасцей: у маленькіх дзяцей аўтарытэт дарослага бясспрэчны. Мяркую, што ў школе фізкультуру прасцей весці мужчынам, а ў садку — нам.

Маладому выхавацелю ў дзіцячым садку давяраюць, пра гэта сведчыць хоць бы той факт, што менавіта яе ўсяго праз паўгода працы адправілі на раённае метадычнае аб'яднанне — там Яўгенія прадстаўляла калегам сваю рэалізацыю заняткаў на стэпах (спецыяльных мабільных пляцоўках для фітнесу). Гэта задумка не ўваходзіць у асноўную праграму навучання, а прапаноўваецца як дадатковая паслуга ахвотным бацькам. Працуючы на паўтары стаўкі, дзяўчына зарабляе каля 400 рублёў. Для такога горада, як Смалявічы, гэта неблагія грошы. Адзінае, на што наракае малады спецыяліст, — для адпачынку тут няма вялікіх магчымасцяў.

Па-першае, усё робіцца пад музыку, якую спецыяльна падбіраюць выхавацелі. Па-другое, сур'ёзную нагрузку маленькім дзецям даваць нельга.

У вольную хвіліну яна звычайна адпраўляецца на стадыён або ў спартзалу.

— У чым плюсы і мінусы маёй работы? — перапытвае дзяўчына. — Самая вялікая перавага — праца з дзецьмі. Яны эмацыянальныя, заўсёды шчырыя. Прыходзіш у панядзелак на работу, бачыш іх усмешкі — і настрой падымаецца. Але гэта можна залічыць і да мінусаў — усё ж такі ад пастаянных стасункаў з дзецьмі хутка стамляешся. Я лічу сваю працу выдатным досведам. Адзінае, калі цяпер пайсці працаваць у школу, давядзецца наноў усё ўспамінаць. Але я сыходзіць не планую, пакуль што мяне ўсё задавальняе.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*
Мінск — Смалявічы — Мінск.

І сабе, і людзям

Моладзь — за новыя тэхналогіі

Трэці год запар у фінале рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» ўдзельнічаюць навучэнцы Маладзечанскага гандлёва-эканамічнага каледжа. У 2015 годзе яны прадставілі праграмны прадукт Create Pit («Памочнік дыетолага»). Летась — адразу дзве мабільныя праграмы.

Аляксандр Стэфановіч і Дзмітрый Каспяровіч.

Сёлета гонар сваёй установы адстойваюць навучэнцы чацвёртага курса спецыяльнасці «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» Дзмітрый Каспяровіч і Аляксандр Стэфановіч. Юныя праграмісты пад кіраўніцтвам выкладчыкаў Зоі Зянько, Марыі Манюк і Вольгі Цыганок распрацавалі спецыяльную мабільную праграму «Music GO» для смартфона або планшэта на платформе Android/IOS, якая дазволіць слухаць музыку за невялікую плату, прычым без выкарыстання інтэрнэт-трафіка.

— Ідэя з'явілася пасля таго, як я ўбачыў замежны аналаг нашага сэрвісу Spotify, аплата якога складала 10 долараў у месяц. Але не ўсе людзі гатовыя столькі плаціць за музыку. Мы вырашылі зрабіць нешта падобнае, але значна таннейшае, — гаворыць Дзмітрый.

У гэтым і ёсць галоўнае адрозненне ад аналагаў. Праграма будзе даступная кожнаму карыстальніку, у любы час ён зможа запусціць яе, уключыць любы плэйліст і пачаць праслухоўванне без падключэння да інтэрнэту. Зручны функцыянал, поўнае ўзаемадзеянне з карыстальнікам — усё гэта ў сэрвісе «Music GO».

Ёсць яшчэ адзін плюс распрацоўкі — гэта абарона аўтарскіх правоў і своеасаблівы крок да вырашэння праблемы музычнага пірацтва. Сваё вынаходніцтва юнакі плануюць прадстаўляць не толькі на конкурс «100 ідэй для Беларусі», але і на іншых значымых імпрэзах, звязаных з IT-тэхналогіямі.

Яна КАЗАКЕВІЧ,
вучаніца 10 класа СШ №11 г. Маладзечна.

Бачыць мэту

Фінал «100 ідэй для Беларусі»: удачы найлепшым!

Усяго нічога засталося да лагічнага завяршэння сёлетняга рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу, які ўжо не першы год праводзіць БРСМ. Напярэдадні фіналу «Чырвонка. Чырвоная змена» працягвае знаёміць чытачоў з самымі крэатыўнымі праектамі маладых дапытлівых розумаў — пераможцаў абласных і мінскага гарадскога этапаў гэтага адмысловага творчага спаборніцтва.

Галоўныя эканамісты аддзела статыстыкі, інвестыцый і будаўніцтва галоўнага статыстычнага ўпраўлення горада Мінска Юлія Бутэвіч і Аляксей Сцецкі прапануюць свой праект — L-картку. Гэта анлайн-платформа для ўпраўлення дысконтнымі, бонуснымі і клубнымі карткамі ў смартфонах спажыўцоў.

— Рынак іх карыстальнікаў імкліва расце: на сёння ў краіне больш за пяць мільёнаў жыхароў маюць смартфоны. Перспектыва развіцця гандлёвай сеткі і ўкаранення сучасных тэхналогій відавочная, — лічаць распрацоўшчыкі. — Зараз у Беларусі падобнага сэрвісу няма. Ён дазволіць спажыўцам пазбавіцца ад шматлікіх пластыкавых картак. Апроч таго, анлайн-платформа будзе інфармаваць аб акцыях, зніжках, спецыяльных праграмах і адкрыцці новых пунктаў продажу. А бізнесу сэрвіс забяспечыць эфектыўны канал камунікацыі са сваімі кліентамі: прапановы будуць паступаць патэнцыйным пакупнікам, а таксама спажыўцам, што знаходзяцца непадалёку ад канкрэтнага гандлёвага цэнтра.

Праграмнае забеспячэнне на падставе камп'ютарных тэхналогій 3D «Мой бяспечны дом» (аўтары распрацоўкі — Вольга Багамаз і Алена Пятрыка з Універсітэта грамадзянскай абароны МНС) прызначана для навучання насельніцтва правілам пажарнай бяспекі ў быце праз мадэляванне аварыйных сітуацый у жылым доме. Для карыстальніка ствараецца максімальна поўная ілюзія знаходжання ў жылым аб'екце тыпу «катэдж» ці «кватэра» з магчымасцю прагляду яго бягучага становішча ў памяшканнях. Канчатковая мэта прадукту — стварыць умовы для засваення і замацавання ведаў аб правілах бяспекі, выпрацаваць навыкі ідэнтыфікацыі іх парушэнняў.

Студэнт першага курса факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ Глеб Машканаў узяўся за распрацоўку канцэпцыі сістэмы маніторынгу і рэагавання на ўцечкі бытавых газаў у шматкватэрных жылых дамах. Яна, падключаная ў кожнай кватэры, будзе днём і ўначы ў аўтаматычным рэжыме рэагаваць на самыя нязначныя ўцечкі бытавога газу і аўтаматычна выклікаць брыгаду аварыйнай службы і самастойна адключаць пад'езд дома ад газазабеспячэння да яе прыезду.

Аспірант Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта Яўген Кузьміч прапанаваў да ўдзелу ў конкурсе зараднае ўстройства для гаджэтаў на аснове сонечных панеляў. Праект маладога чалавека базіруецца на стварэнні грамадскіх зарадных станцый, выраблены з выкарыстаннем вядомых партатыўных зарадных устройстваў, якія плануецца ўстанаўліваць на вуліцах Брэста ў спецыяльна адведзеных месцах. Падчас зарадкі на станцыях можна будзе скарыстацца бясплатнай паслугай Wi-Fi. На думку аўтара, асноўнай перавагай праекта з'яўляецца зручная сістэма зарадкі мабільных устройстваў.

Нізкавольтны гукавы індыкатар «Антысон» для павышэння бяспечнасці кіравання аўтамабілем у начны час прадставіць у фінале навучэнец другога курса Лунінецкага дзяржаўнага політэхнічнага прафесійна-тэхнічнага каледжа Мікалай Лукашэвіч. Гэта ўстройства перашкаджае засыпанню кіроўцаў падчас руху. Індыкатар разам з элементам сілкавання выкананы на аднабаковай пячатнай плаце ў выглядзе скабы, што дазваляе, уключыўшы мікрапераключальнік, замацаваць яго за вухам. Пры глыбокім нахіле галавы падчас засыпання кантакты датчыка нахілу замкнуцца і ўключаць індыкатар — гучны сігнал імгненна разбудзіць кіроўцу. Для кожнага канкрэтнага выпадку можна падабраць найлепшае спалучэнне параметраў контуру: для атрымання максімальнай гучнасці пры мінімальным спажыванні току.

Наступны аўтар выносіць на суд журы праект «Забаўляльна-экалагічны аграпарк «Кукурузны лабірынт» «Кукурузаляндыя». Што гэта такое, спытаеце вы?

— Кукурузныя лабірынты — від сямейных забаў, якія існуюць у свеце ўжо не адно дзесяцігоддзе. Да Беларусі ідэя пакуль яшчэ не дайшла, аднак суседнія дзяржавы ўжо могуць пахваліцца ўласнымі кукурузнымі аграпаркамі і квэстамі ў кукурузе, — тлумачыць аўтар праекта Марына Бандык, першы сакратар Горацкага райкама БРСМ.

Аграпарк можа быць размешчаны на тэрыторыі раёна. Агульная яго плошча — 1,8 гектара. Ён разлічаны ў першую чаргу на дзяцей і моладзь і будзе ўключаць у сябе шэраг прапаноў забаў. Тэрыторыя дзеліцца на зоны: кукурузны лабірынт (для моладзі і дарослых), лабірынт з вяровак, цюкоў саломы, ёсць зона для пікнікоў, атракцыёны, арт-агарод і батут. Падсілкавацца можна на фудкорце, а адпачыць — у лаўнж-зоне ў гамаках. Па задумцы, на тэрыторыі аграпарка рэгулярна будуць праходзіць розныя майстар-класы, фестывалі, а ў кукурузным лабірынце — квэсты для дзяцей і дарослых.

Навучэнцы другога курса Магілёўскага дзяржаўнага эканамічнага прафесійна-тэхнічнага каледжа Максім Мінкін, Лізавета Давыдзенка і Мікіта Кайдо разам з навуковым кіраўніком Анжэлай Юнцэвіч распрацавалі мабільную праграму «Кішэнны фармацэўт», якая можа працаваць як у анлайн-, так і афлайн-рэжыме. Карыстальнік мае магчымасць весці ўлік сваіх лекавых сродкаў, запісваючы іх у «Аптэчку», ставіць напамінанне аб часе прыёму прэпаратаў і ў экстранных выпадках выклікаць хуткую дапамогу праз кнопку хуткага выкліку. Аўтары кажуць аб адсутнасці ў нас нечага падобнага.

...Чый праект з больш як сотні прадстаўленых у фінале прызнае найлепшымі журы? Хутка даведаемся!

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*